**А. І. Бабко,**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*і метадалогіі гуманітарных навук*

# ДЫЯЛАГІЧНЫЯ СТРАТЭГІІ ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАСОФСКІХ ДЫСЦЫПЛІН ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ СТУДЭНЦКАЙ АЎДЫТОРЫІ

У цяперашні час мы сутыкаемся са значнай колькасцю замежных студэнтаў у адукацыйным асяроддзі Беларусі, і ў будучыні яна, безумоўна, будзе павялічвацца. Гэты прагноз грунтуецца на аналізе працэсаў, што адбываюцца ў нашай адукацыі, інтэрнацыяналізацыя і інтэграцыя якой ў міжнародную адукацыйную сістэму ўзрастае. У такіх умовах вельмі важна выявіць асноўныя характарыстыкі выкладчыцкай працы і выкладання пэўных дысцыплін у міжнароднай студэнцкай аўдыторыі. Дадзенае даследаванне мае на мэце вырашэнне згаданай задачы – высвятленне пэўных яе момантаў, бо яна мае складаны, комплексны характар адносна філасофскіх дысцыплін. Тут закранаюцца тыя яе аспекты, што маюць дачыненне да дыялагічнага складніка адпаведнага працэсу, найперш з яго міжкультурнай існасцю: выкладанне філасофскіх дысцыплін у міжнародным асяроддзі – гэта своеасаблівы міжкультурны дыялог, галоўнай асаблівасцю якога з’яўляецца яго філасофскі змест.

Выкладчык, які працуе з інтэрнацыянальнай студэнцкай аўдыторыяй, павінен рыхтавацца да вядзення дыялогу. Істотным момантам дадзенай падрыхтоўкі з’яўляецца ўсведамленне адметнасці філасофскіх традыцый, якія разгортваюцца ў розных культурах, а таксама грунтоўных характарыстык іх узаемадзеянняў. У першую чаргу ён мусіць звярнуць увагу на спецыфіку заходняга і ўсходняга філасофскага мыслення.

Найважнейшай асаблівасцю заходняй філасофіі з’яўляецца яе пераважная арыентацыя на стандарты рацыянальнасці, што істотным чынам збліжае яе з навукай. Дэмакратычны лад палітычнага жыцця сфарміраваў сацыяльную аснову для такой арыентацыі: з моманту свайго нараджэння яна была глыбока звязана з дэмакратыяй, яе карані трэба шукаць у дэмакратычных гарадах-дзяржавах (полісах). Гэтая палітычная сістэма



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стымулявала рацыянальны падыход да рэчаіснасці, матывавала філасофскую думку і навуковыя даследаванні, выклікала грамадскія дыскусіі пра лепшыя спосабы вырашэння грамадскіх спраў. Вынікі такіх дыскусій вызначаліся з улікам ступені абгрунтаванасці выказаных прапаноў, пераканальнасці прыведзеных на іх карысць аргументаў – гэта значыць пры дапамозе рацыянальных працэдур.

Арыентацыя заходняй філасофскай думкі на ідэалы і нормы рацыянальнасці і яе глыбокая сувязь з навукай назіраецца ўжо ў працэсе яе фарміравання, які адбываўся ў «канкурэнцыі з міфам» [5, с. 2] і з самага яго пачатку быў звязаны з больш-менш выразным размежаваннем уласнага зместу і інтэлектуальных тэхнік ад міфалагічнай формы засваення свету, больш ці менш паслядоўным вызваленнем ад ірацыянальных міфалагічных узораў і стандартаў пазнання, разумення і інтэрпрэтацыі. «Больш-менш» тут азначае, што супрацьстаянне антычнай філасофіі і міфа не было абсалютным, што «старажытнае Асветніцтва» ніколі не было такім радыкальным, як адпаведны феномен XVIII ст.

Гэтая сувязь назіраецца нават у сярэднявечную эпоху, для якой характэрна перавага рэлігіі (і ў гэтым плане яна вельмі падобная на традыцыйнае ўсходняе грамадства). Хоць філасофія ў той час і разглядалася як служка тэалогіі, яна не была абсалютна адарванай ад навукі і ад ідэалу рацыянальнага пазнання свету. Пра гэта сведчыць, напрыклад, той факт, што Сярэднявечча з’яўляецца ўзорнай эпохай у кантэксце развіцця логікі (дзякуючы даследаванням, праведзеным у сферы схаластыкі) [2, с. 15–16]. Можна таксама адзначыць, што наміналістычная традыцыя ў схаластычным мысленні рыхтавала глебу для ўзнікнення навукі сучаснага тыпу (навукі, што грунтуецца на назіраннях і эксперыментах, і глыбока звязанай з матэматычнай апрацоўкайіх вынікаў).

Згаданае ўзнікненне ў пачатку Новага часу мела грунтоўнае значэнне для філасофіі: новая навука выступіла як крыніца цікавых, важных праблем. Разам з тым яна кінула своеасаблівы выклік філасофскаму мысленню, паставіўшы яго перад неабходнасцю легітымізаваць і апраўдаць сябе дзеля няўхільнага ўзрастання ролі і значэння навуковага пазнання ў грамадстве. У выніку рэфлексіі над працэсамі, што адбываліся ў кагнітыў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най сферы, у заходняй філасофскай думцы сфарміраваліся два падыходы да разгляду ўзаемадачыненняў філасофскага і навуковага пошуку. З аднаго боку, тут можна адзначыць традыцыі з выразнай арыентацыяй на навуку (Асветніцтва, розныя віды пазітывізму, сучаснае натуралістычнае мысленне). З іншага боку, існавалі і існуюць альтэрнатыўныя школы і напрамкі мыслення (рамантызм, гегельянства, герменеўтыка). Аднак ва ўсіх выпадках наданне асаблівай увагі навуцы было асноўнай адметнай рысай заходняй філасофіі і арыентацыя на навуку пераважала і пераважае ў заходняй філасофскай думцы. Прыхільнікі альтэрнатыўнай пазіцыі таксама прызнаюць гэты факт (Г.-Г. Гадамер піша, напрыклад, пра перавагу, якую сучасная навука мае ў межах філасофскага высвятлення паняццяў пазнання і праўдзівых ведаў [3, с. 1]).

Усходняе мысленне адрозніваецца ад заходняга перш за ўсё сваёй арыентацыяй на рэлігію. З прычыны такой арыентацыі ў абсягу заходняй філосафіі мелі месца вострыя дыскусіі адносна філасофскага патэнцыялу ўсходняй думкі: ці дастатковы гэты патэнцыял, каб уключыць яе ў гісторыю філасофіі? [5, с. 486]. Істотная блізкасць усходняга мыслення да рэлігіі глыбока звязана з яе арыентацыяй на традыцыю і з абмежаваннямі інтэлектуальнай свабоды. Паводле Г. Гегеля, прынцып інтэлектуальнай свабоды неабходны для сапраўднага філасофскага мыслення, і таму, як ён лічыць, усходняя думка не можа быць ідэнтыфікавана як філасофія ў належным значэнні гэтага тэрміна. Крытыка Г. Гегеля скіравана найперш на недаацэнку чалавечай індывідуальнасці ва ўсходняй культуры, што павінна разглядацца як істотны бар'ер і для зараджэння сапраўднай філасофіі [4, с. 138–141]. Прыхільнікі процілеглага пункту гледжання (напрыклад, нямецкія рамантыкі) выявілі ва ўсходняй культуры калыску чалавецтва і адпраўную кропку ўсіх яго інтэлектуальных дасягненняў, у тым ліку філасофіі [5, с. 486].

Неабходна адзначыць, што блізкасць усходняй філасофскай традыцыі да рэлігіі не была татальнай і ўсёабдымнай (як не была татальнай і блізкасць заходняга філасофскага мыслення да навукі). У некаторых тэкстах, прысвечаных філасофскім праблемам сучаснага прыродазнаўства, выкладзена пазіцыя, паводле якой усходняя філасофія адпавядае актуальнаму перыяду развіцця прыродазнаўчых навук і таму павінна актыў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на выкарыстоўвацца ў працэсе распрацоўкі асноў навуковага пазнання (у глыбокай сувязі з заходняй традыцыяй) [6, с. 22].

Правамерна сцвярджаць, што пры ўсёй спецыфіцы заходняй і ўсходняй філасофскіх традыцый яны выяўляюць таксама пэўную блізкасць паміж сабой. І моманты, якія іх адрозніваюць, і тыя аспекты, у якіх яны судакранаюцца, могуць быць асновай для плённага дыялагічнага выкладання філасофскіх дысцыплін у інтэрнацыянальнай студэнцкай аўдыторыі. Іх можна задзейнічаць, напрыклад, для арганізацыі дыскусій на семінарскіх занятках.

Філасофія ўвогуле выступае як духоўная сфера, якая найістотнейшым чынам спрыяе актыўнаму ўжыванню дыялагічных стратэгій. Уся яе гісторыя з'яўляецца вялікім інтэлектуальным дыялогам. Каб эфектыўна задзейнічаць высокі дыялагічны патэнцыял філасофскага мыслення, неабходна мець на ўвазе, што філасофію нельга навязаць. Яе можна толькі выказаць, падмацаваўшы як мага больш моцнымі аргументамі. Сучасны нямецкі філосаф П. Слотэрдайк вылучыў і дэталёва прааналізаваў выслоўе вядомага паэта П. Цэляна, згодна з якім паэзія не навязваецца, яна падстаўляецца [1, с. 234]. Філасофія ў пэўным сэнсе таксама падстаўляецца. Аднак «падстаўленне» філасофіі мае характар аргументаванага маўлення, якое патрабуе і чакае аргументаванага маўлення ў адказ.

Неабходна адзначыць, што грунтоўнай перадумовай паспяховага выкладання філасофскіх дысцыплін інтэрнацыянальнай студэнцкай аўдыторыі з'яўляецца прынцыповае выключэнне (нават самых нязначных) праяў пыхлівага стаўлення да іншых (філасофскіх) культур. Выкладчык павінен быць скіраваным на дыялог увогуле, на міжкультурны дыялог і на міжкультурны дыялог філасофскага характару. Дыялагічныя зносіны з'яўляюцца плённымі, аднак, калі іх удзельнікі маюць уласную, глыбока распрацаваную, грунтоўна важную для іх пазіцыю. Таму адкрытасць у дачыненні да іншага і да яго аргументаў павінна спалучацца з патрэбай і ўменнем шчыра, адкрыта і аргументавана адстойваць сваю рацыю. Толькі ў такім выпадку выкладчык будзе цікавым аўдыторыі (і нацыянальнай, і інтэрнацыянальнай). Выканаць абодва патрабаванні – справа нялёгкая, аднак неабходная ў дадзенай сітуацыі.

Такім чынам, сярод галоўных вынікаў даследавання найперш неабходна ўказаць артыкуляцыю дыялагічнага характару вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кладання філасофскіх дысцыплін у міжнародным адукацыйным асяроддзі, што патрабуе ад педагога адпаведнай падрыхтоўкі. Важным яе момантам з’яўляецца глыбокае засваенне спецыфікі філасофскіх традыцый, што разгортваюцца ў розных цывілізацыйных і культурных абсягах. Разам з тым выкладчык павінен узняць да высокага дыялагічнага ўзроўню ўласнае мысленне, зрабіць яго адкрытым для аргументаў, што паходзяць з іншых філасофскіх культур, адмовіцца ад усякай пыхлівасці ў дачыненні да іх.

1. *Слотэрдайк, П.* Прыйсьці на сьвет – прыйсьці да мовы (Франкфурцкія лекцыі) / П. Слотэрдайк // Arche. Пачатак. – 2005. – № 2. – С. 234–303.

2. *Bocheński, J. M.* Formale Logik / J. M. Bocheński. – 5. Aufl. – Freiburg, Műnchen : Karl Alber, 1996. – 648 s.

3. *Gadamer, H-.G.* Hermeneutik: Wahrheit und Methode / H.-G. Gadamer. // Gesammelte Werke / H.-G.Gadamer. – Tübingen : J. C. B. Mohr (Paul Siebeck), 1990. – Bd. 1 : Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik. – 495 s.

4. *Hegel, G. W. F.* Vorlesungen über die Geschichte der Philosophie: Erster Teil / G. W. F. Hegel // Werke: in 20 Bd. / G. W. F. Hegel. – Bd. 18. – Frankfurt am Main : Suhrkamp, 1979. – 561 s.

5. *Helferich, C.* Geschichte der Philosophie: von den Anfängen bis zur Gegenwart und östliches Denken / C. Helferich mit einem Beitrag von P. C. Lang. – 2., überarb. und erw. Aufl. – Stuttgart : Metzler, 1992. – 571 s.

6. *Prigogine, I.* Order out of Chaos: Man’s New Dialogue with Nature / I. Prigogine, I. Stengers. – London : Flamingo, 1985. – 349 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ю. Г. Балодис,**
*кандидат культурологии, доцент,*
*доцент кафедры менеджмента*
*социально-культурной деятельности*

## К ВОПРОСУ ПРЕПОДАВАНИЯ «ПРИКЛАДНОЙ КУЛЬТУРОЛОГИИ» В БГУКИ

Образовательный стандарт Республики Беларусь «Высшее образование. Первая ступень. Специальность 1-21 04 01 Культурология (по направлениям)» (2013) утверждает, что прикладная культурология изучает процесс освоения, сохранения и распространения ценностей культуры, постижения индивидом